ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1933

24

САКАВІКА

ЧАЦВЕР

№ 11 (1387)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

ПУЦЁЎКА Ў ЖЫЦЦЁ

КАЛЯ ДЗВЯРЭЙ АЎДЫТОРЫІ — гаманлівы натоўп. Ідзе размеркаванне пяцікурснікаў беларускага аддзялення філфака. Пяць гадоў юнакі і дзяўчаты ўпарта і натхнёна набліжаліся да сваёй мары — стаць настаўнікамі, і вось праз нейкую гадзіну-другую ўсе 88 чалавек атрымаюць канкрэтную пуцёўку ў жыццё.

На хвілінку заглянем у аўдыторыю. Па аднаму падыходзяць да стала размеркавальнай камісіі студэнты. У саставе камісіі — прадстаўнікі рэктарата, дэканата, Міністэрства асветы БССР. Зачытваецца характарыстыка. Члены камісіі задаюць пытанні. Часам у студэнта складанае сямейнае становішча, трэба параіцца, куды накіраваць не толькі выпускніка, але і цэлую студэнцкую сям'ю.

— Вам прапануецца... Згодны?

— Згодзен.

— Распішыцеся, калі ласка.

І да камісіі падыходзіць чарговы студэнт.

Універсітэт накіроўвае сваіх выхаванцаў у шматлікія гарады і вёскі рэспублікі. Застаецца жадаць і спадзявацца, што ўсе яны будуць выдатнымі спецыялістамі, не уроняць гонар роднага універсітэта, вышэй узнімуць яго аўтарытэт і славу. І напэўна самым радасным для сённяшніх пяцікурснікаў будзе момант, калі іх выхаванцы таксама адчыняць дзверы універсітэтскіх аўдыторый.

НА ЗДЫМКАХ: працуе размеркавальная камісія; Уладзімір і Валянціна КУРНАТОВІЧЫ будуць працаваць у Уздзенскім раёне.

Тэкст і фота **В. Шачака.**

"Беларускі універсітэт"

мэлетаип

• Учора • Сёння • Заўтра •

НА ПАСЯДЖЭННІ

бюро камітэта камсамола універсітэта абмеркаваны пытанні падрыхтоўкі і правядзення грамадска-палітычнай атэстацыі на філалагічным факультэце. Вопыт работы камітэта камсамола факультэта ў гэтым напрамку адобраны. Бюро камітэта камсамола універсітэта зацвердзіла тэрміны правядзення палітзаліку ў бягучым навучальным годзе.

Ю. ВАРАТНІЦКІ,
кіраўнік прэс-цэнтра камітэта камсамола.

АБМЕРКАВАННЕ

кнігі П. І. Ткачова «Як разгаралася полымя» прайшло на факультэце журналістыкі. Канферэнцыю падрыхтавалі члены студэнцкага навуковага таварыства. Цікавымі былі іх даклады аб сувязі кнігі з сучаснасцю, аўтарскім майстэрстве ў стварэнні вобраза У. І. Леніна. Аб тым, як нараджаліся главы гэтай аповесці і іншых твораў, якія ўвайшлі ў беларускую літаратурную Ленініяну, цікава расказаў аўтар.

І. ЗЫБАЙЛА,
студэнт факультэта журналістыкі.

ДАГАВОР

аб супрацоўніцтве ў справе інтэрнацыянальнага выхавання моладзі паміж камітэтам камсамола універсітэта, зямляцтвам чэхаславацкіх студэнтаў г. Мінска і інтэрклубам «Мерыдыян» Мінскага падшыпнікавага завода № 11 падпісаны на сумесным пасяджэнні актывістаў інтэрнацыянальнага руху.

В. ЧАРНЯЎСКІ,
член прэс-цэнтра прафкома.

КАНФЕРЭНЦЫЯ

таварыства аховы прыроды БДУ імя У. І. Леніна закончыла сваю работу. На ёй разгледжаны вынікі дзейнасці таварыства за мінулы год. З паведамленнем аб вопыце работы дружыны па ахове прыроды Беларускага тэхналагічнага інстытута выступіў У. Г. Бірук.

Г. БАЗЫЛЕНКА,
старшыня таварыства аховы прыроды універсітэта,
М. ВАСІЛЕЎСКАЯ,
старшы навуковы супрацоўнік.

ПРЭЗІДЫУМ ПРАФКОМА

універсітэта на сваім чарговым пасяджэнні разгледзеў работу прафбюро радыёфізічнага факультэта па арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва на лепшую вучэбную групу.

Н. ТУРОМША,
намеснік старшыні прафкома.

ЗАЛЕЖЫЦЬ АД КОЖНАГА

НА ПАРАДКУ ДНЯ — ДЫСЦЫПЛІНА

Дысцыпліна на заводзе, у лабараторыі, у ВНУ... Ці не яна з'яўляецца гарантам паспяховага выканання любой справы? Сталявару — варыць метал, хлебаробу — сеяць і ўбіраць ураджай, вучонаму — адкрываць гарызонты нязведанага, студэнту... Якраз пра студэнта, пра яго вучобу, самадысцыпліну і гавораць сёння старшыня штаба «Камсамольскага пражэктара» універсітэта А. Шыбут і сакратар партбюро факультэта прыкладной матэматыкі М. Федзяня.

А. ШЫБУТ:

ВЫПУСКНІК БДУ імя У. І. Леніна павінен быць высокакваліфікаваным спецыялістам, чалавекам грамадска актыўным, надзеленым шырокай эрудыцыяй і высокай культурай. Каб выхаваць яго такім, камсамольская арганізацыя заклікае пастаянна клапаціцца аб якасці ведаў, якія атрымліваюць студэнты, аб павышэнні эфектыўнасці вучэбнага працэсу.

На жаль, гэтага не заўсёды атрымліваецца. З горыччу прыходзіцца ‘канстатаваць, што работа акадэмічнага сектара камітэта ВЛКСМ нярэдка пускаецца на самацёк. Бясспрэчна, важнай і патрэбнай справай з'яўляюцца і будатрады, і агляды мастацкай самадзейнасці, і спартыўныя спаборніцтвы, і турысцкія паходы, і многае-многае іншае з насычанага жыцця сённяшняга студэнцтва. Але ўсё гэта ніякім чынам не павінна перашкаджаць галоўнаму — вучобе. Вось тут і трэба сказаць сваё слова камітэтам камсамола. Яны здольны дапамагчы студэнтам больш правільна арганізаваць рабочы дзень, садзейнічаць стварэнню неабходных умоў для працы і адпачынку ў інтэрнатах. У іх кампетэнцыю ўваходзяць таксама заахвочванне выдатнікаў, актывістаў і, безумоўна, бязлітасная крытыка двоечнікаў, прагульшчыкаў і лайдакоў. Іменна таму ўсе праверкі бягучай паспяховасці, вучэбнай дысцыпліны штаб «КП» імкнецца праводзіць у цесным узаемадзеянні з акадэмічнымі сектарамі камітэта камсамола, вучэбна-выхаваўчымі камісіямі факультэтаў.

Але наладзіць такое ўзаемадзеянне часта не ўдаецца. Часцей за ўсё акадэмсектары абмяжоўваюцца толькі канстатацыяй колькасці адсутнічаючых і спазніўшыхся. Аналіз вынікаў рэйдаў амаль не праводзіцца. На факультэтах няма цвёрдай сістэмы, якая дазваляла б ажыццяўляць пастаянны кантроль за вучэбнай дысцыплінай. У камітэтах камсамола адсутнічаюць звесткі аб студэнтах, якія рэгулярна прапускаюць заняткі ці спазняюцца. Практычна не кантралюецца акадэмічнымі сектарамі бягучая паспяховасць студэнтаў. Экраны бягучай паспяховасці, што знаходзяцца ў дэканатах усіх факультэтаў, свайго прызначэння часта не выконваюць.

Ды і выдатнікам ёсць на што паскардзіцца: не заўсёды іх праца атрымлівае патрэбны рэзананс. Адзін прыклад: на універсітэцкай Дошцы гонару ёсць фатаграфіі людзей, якія закончылі БДУ два-тры гады назад. А вось для некаторых сённяшніх выдатнікаў месца не знайшлося.

Значную ролю ў павышэнні паспяховасці, умацаванні вучэбнай дысцыпліны павінны адыгрываць камсоргі. Іх асабісты прыклад здольны аказваць як станоўчае, так і адмоўнае ўздзеянне. І, вядома, там, дзе камсорг сам не імкнецца да ведаў, дазваляе сабе іншы раз прагуляць лекцыю, не можа быць і размовы аб атмасферы патрабавальнасці да якасці ведаў. А ў выніку — выпускнік універсітэта зможа стаць і добрым спартсменам, і актыўным грамадскім дзеячам, і проста цікавым чалавекам, але так і не стане спецыялістам вышэйшай кваліфікацыі.

М. ФЕДЗЯНЯ:

ДЫСЦЫПЛІНА — працоўная і выканаўчая, вучэбная і партыйная — першааснова любой справы. Умацаванне яе, удасканальванне формы і зместу работы ў калектыве з'яўляецца патрабаваннем сённяшняга дня. Партыйнае бюро факультэта разумее гэта і імкнецца так рашыць пытанне, каб самадысцыпліна кожнага адпавядала нормам сацыялістычнага ладу жыцця.

На партыйным сходзе, які адбыўся ў лютым, зацверджаны мерапрыемствы партыйнага бюро, дэканата, камітэта камсамола і прафбюро па ўмацаванню дысцыпліны ў кожнай групе, на кафедрах факультэта. Паралельна са сходам камуністаў прайшлі сходы ў камсамольскіх групах, нарады старост, дзе ў цэнтры ўвагі была вучэбная дысцыпліна.

Але гэта толькі арганізацыйныя мерапрыемствы. Канкрэтныя справы наступныя: штотыднёвы кантроль за наведваннем студэнтамі заняткаў ускладзены на намесніка дэкана факультэта М. М. Труша. І трэба адзначыць, што кантроль прыносіць свой плён. Што ж уяўляе сабой новаўвядзенне? Старасты вучэбных груп сумесна з выкладчыкамі кантралююць наведванне студэнтамі лекцый, семінарскіх заняткаў. Звесткі аб ходзе праверак рэгулярна падаюцца ў дэканат, іх вынікі пастаянна знаходзяцца ў полі зроку камітэта камсамола факультэта.

Асаблівыя патрабаванні за парушэнне дысцыпліны прад'яўляюцца да актывістаў. Толькі за апошні час 29 членаў ВЛКСМ — камсоргаў груп і кафедр вызвалена ад выканання грамадскіх даручэнняў. Гэта, напрыклад, сакратар камсамольскай арганізацыі кафедры вылічальнай матэматыкі Раіса Мандрукевіч, камсорг 3-й групы І курса Ала Барыкоўская.

І, вядома, самыя высокія патрабаванні да камуністаў. Што ўтойваць, ёсць яшчэ члены партыі, якія фармальна адносяцца да выканання сваіх непасрэдных абавязкаў. Так, пастаўлена на від за дрэнную вучобу камуністам Наталлі Сапаненка і Наталлі Лапанавай. Партыйная патрабавальнасць — вось адно са складаемых поспеху.

Вялікая, напружаная работа наперадзе. Яе вынікі, несумненна, у многім будуць залежаць ад нас — камуністаў, актывістаў факультэта прыкладной матэматыкі.

Запісала Г. ГРЭЛЬ.

СВЯТЛО ЯГО ЛЁСУ

Спаўняецца 60 гадоў Герою Савецкага Саюза, палкоўніку запасу, кандыдату філасофскіх навук, выкладчыку кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі БДУ імя У. І. Леніна Мікалаю Якаўлевічу ЗАЙЦАВУ.

ЗАКОНЧЫЎСЯ ЧАРГОВЫ будатрадаўскі дзень. Па дарозе ў вёску ішла невялікая група байцоў. Стомленыя, яшчэ не астыўшыя ад напружанай працы, рабяты ажыўлена размаўлялі. Сярод іх быў пажылы чалавек, апрануты, як і ўсе, у рабочую спяцоўку. Гэта—ганаровы баец атрада Герой Савецкага Саюза М. Я. Зайцаў.

Ён прыехаў на Пскоўшчыну па запрашэнню студэнтаў, ды і самому хацелася на месцы паглядзець, як працуюць тыя, з кім кожны дзень сустракаўся ва універсітэцкай аўдыторыі.

Ганаровы баец стаў рэальным байцом. Запомніўся будатрадаўцам гэты дзень, які Мікалай Якаўлевіч правёў на «бетоне» разам з брыгадай, што будавала збожжаток. З непрывычкі ныла спіна, шчымелі ад рыдлёўкі рукі. Але калі ветэран глядзеў на ажыўленыя твары студэнтаў, стомленасць адступала.

Мікалай Якаўлевіч, звычайна стрыманы на афіцыйных сустрэчах, не скупіўся на словы. На ціхай прасёлачнай дарозе адна за другой у яго памяці ажывалі яркія карціны і вобразы, узнікалі твары таварышаў і баявых сяброў.

Біяграфія Мікалая Зайцава вырастала з вайны, якую ён пачаў васемнаццацігадовым лётчыкам-штурмавіком. Гэта быў вымушаны палёт да мары, накіраванай у неадкрытыя вышыні, куды за легендарным Чкалавым імкнуліся амаль усе маладыя пілоты.

Супраць жорсткай вайны патрэбна было змагацца, патрэбна было абараняць калоны знясіленых бежанцаў на бясконцых дарогах, гарады і вёскі, якія ўчора радавалі вочы, а сёння мільгаюць пад крыламі знявечанымі развалінамі і накіраванымі ў неба дымамі пажарышчаў.

Патрэбна была асобая мера вытрымкі, мужнасці, сілы волі, майстэрства пілотаў, каб стрымаць наступленне фашыстаў. Неабходны быў цвёрды мужчынскі характар, здольны вынесці няўдачы, паражэнні і непапраўныя страты. Патрэбны быў вопыт вядзення бою штурмавой авіяцыяй для выканання галоўнай задачы — нанясення рашучых удараў і перамогі ворага.

Ці магчыма спалучэнне ўсіх гэтых якасцей у маладым пілоце? Аказваецца, магчыма. Сёння мы ведаем сотні праслаўленых лётчыкаў, якія дасягнулі вышэйшай дасканаласці ў вядзенні паветранага бою. Такія, як Мікалай Зайцаў, набліжалі перамогу.

Са сваімі баявымі таварышамі ён уважліва вывучаў вопыт вядомых паветраных байцоў. Побач з ім, у адным небе, лятаў сам Пакрышкін. Было на каго раўняцца, з каго браць прыклад. Штурмавік Зайцава разбураў масты, дыбіў да неба і кідаў на зямлю фашысцкія эшалоны з жывою сілай і баявой тэхнікай. Страшная была гэта «работа», велізарную шкоду наносіла яна ворагу, але і самі лётчыкі аддавалі вельмі дарагую даніну вайне.

Фашысцкія зенітчыкі збівалі самалёт Зайцава, неаднаразова даводзілася яму весці падбітую машыну на вымушаную пасадку. А колькі пагражаючых ран было на корпусе яго самалёта!..

Вострым болем назаўсёды ўвайшоў у сэрца бой за пераправу на Днястры. Нібы ржавы асколак, ён будзіць памяць, а ў вачах свеціцца падаючы факел самалёта таварыша і сябра Віктара Марозава. Аслабеўшай рукой ён накіраваў сваю машыну ў цэнтр маста, цераз які бясконцым патокам рухаліся фашысцкія войскі.

Зайцаў не чуў страшнага выбуху, падкінуўшага ў паветра мост. Ён акамянеў ад таго, што нельга дапамагчы таварышу, абараніць, што яго ўжо няма.

Сябры ляцелі, і часам іх не маглі дачакацца. Вайна забірала іх, прымушала тых, хто застаўся, падвойваць свае сілы ў барацьбе з ненавісным ворагам. За Віктарам Марозавым не вярнуўся з задання Павел Леанідаў. У стройнага лейтэнанта асунуліся плечы, стаў больш стрыманым погляд. На фюзеляжы яго машыны паявіўся надпіс: «За Паўла Леанідава!» Гэта была не толькі памяць пра таварыша, а працяг яго баявога ліку.

Штурмавік Зайцава «вывальваўся» на варожыя пазіцыі з-за лесу, выплываў з-пад сонца, абрушваўся на асабліва важныя ўмацаванні, скапленні баявой тэхнікі з засады, калі яго таварышы адцягвалі на сябе зенітныя батарэі.

— Злосці назапасілася вельмі многа, — гаворыць Мікалай Якаўлевіч.—З невялікай вышыні добра было відаць усё, што тварылі захопнікі на нашай зямлі. Наша нянавісць пастаянна расла.

У цяжкіх умовах вайны закончылася фарміраванне характару Зайцава як чалавека і афіцэра Чырвонай Арміі. Яго сумленнасць і прамата, настойлівасць і дабрата выклікалі павагу, а высокі прафесіяналізм і храбрасць у баях сталі неад'емнымі якасцямі асобы маладога пілота. Яго ўчынкі вызначаліся сумленнасцю і прынцыповасцю, дружба была праверана ў суровых выпрабаваннях.

Ён зрабіў 185 баявых вылетаў. Ці многа гэта? Вельмі многа для самай крывавай з войнаў. Снарады пушак яго самалёта знішчалі танкі, бронетранспарцёры, гарматы, аўтамашыны, скошвалі жывую сілу ворага. Даводзілася маладому штурмавіку ў паветраных баях збіваць і варожыя самалёты.

Самаадданасць і гераізм былі асновай выканання кожнага баявога задання. Ва Указе Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб прысваенні яму звання Героя Савецкага Саюза ў 1945 годзе так і запісана: «...За мужнасць і гераізм...». Тады Мікалаю Зайцаву споўнілася 22 гады.

Сканчэнне вайны дыхнула на маладых воінаў вясеннім абнаўленнем Перамогі. Мірнае жыццё трывала «станавілася на крыло», як гаварылі лётчыкі. І яны, маладыя і здаровыя, убіралі яго з новымі надзеямі і марамі. Мікалай Зайцаў асвойвае знішчальную авіяцыю, а затым перасаджваецца з вінтакрылых машын на рэактыўны самалёт. Тут раскрыўся талент ваеннага лётчыка новага часу. Палкоўнік М. Я. Зайцаў выдатна лятаў у любых пагодных умовах, на розных шыротах, як гаворыцца, на сушы і на моры, увасабляючы ў жыццё сваю мару аб нязведаных вышынях і дальніх пералётах. Тонкае веданне новай тэхнікі, высокае майстэрства пілатажу, заснаваныя на ўпартасці, вытрымцы, працаздольнасці, вывелі яго ў лік вядучых лётчыкаў-рэактыўшчыкаў. Мікалай Зайцаў зноў на баявым пасту. На самых высокіх вышынях камандзір эскадрыллі знішчальнікаў ахоўваў межы нашай Радзімы ад пранікнення самалётаў-шпіёнаў.

У характары ваеннага лётчыка ў гэты час паявілася цікавая дэталь, якая наклала адбітак на яго далейшы лёс. Мікалай Якаўлевіч зацікавіўся філасофіяй. Адразу пасля дэмабілізацыі з арміі ў няпоўныя сорак гадоў у 1961 годзе паступіў на філасофскае аддзяленне БДУ імя У. І. Леніна. Мікалай Якаўлевіч асвойвае новую прафесію. Адразу працуе настаўнікам у школе, а затым выкладчыкам ва універсітэце. Яго цягнула да людзей, як і ў неба. Там, за воблакамі, ён быў сам-насам з самалётам, прыладамі, сваімі думкамі. Людзі ж напаўнялі яго сэрца спакоем, бясконцай разнастайнасцю характараў.

— Спачатку было нязвыкла выступаць у ролі выкладчыка, — расказвае Мікалай Якаўлевіч. — Гэта складаней, чым даклад на разборы палётаў. Вопыт прыйшоў пазней. Стала зразумелай формула: вучачы — выхоўваць. Давялося ўпарта працаваць самому, абараняць кандыдацкую дысертацыю.

Вучнямі Мікалая Якаўлевіча былі многія пакаленні студэнтаў. Для іх ён высокі аўтарытэт, увасабленне мужнасці, гераізму і незвычайнай сціпласці.

Як член бюро парткома універсітэта Мікалай Якаўлевіч узначальвае партыйную камісію. Справы сустракаюцца розныя, як і лёсы людзей. Аднак да ўсіх адносіны строгія, прынцыповыя. У камуніста М. Я. Зайцава асаблівае адчуванне праўды, якую ён мае права сказаць чалавеку ў вочы, нават калі яна і вельмі горкая.

Мікалай Якаўлевіч больш за ўсё цэніць у людзях маральную ўстойлівасць характару, сілу волі, мэтанакіраванасць, грамадскую актыўнасць і смеласць.

Ён імкнецца выхаваць гэта ў студэнтаў, маладых людзей, з якімі часта сустракаецца як удзельнік вайны. Хвалюецца, уважліва ўглядаецца ў дапытлівыя вочы субяседнікаў, спрабуе разабрацца, што хаваецца за іх інтарэсам: захапляючыя дэтэктыўныя гісторыі і сцэны паветраных баёў? Ці яны хочуць адчуць напружанне душэўных і фізічных сіл сваіх равеснікаў на вайне? Павагу бачыць на тварах юнакоў і дзяўчат Мікалай Якаўлевіч, душэўны боль за яго баявых таварышаў, за ўсіх салдат, якія ўжо ніколі не прыйдуць на сустрэчу з людзьмі. Цёпла становіцца на душы ад такіх пачуццяў.

А. СЛУКА,
лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі.

Слова – грамадзяніну Балгарыі

18 САКАВІКА 1948 ГОДА застанецца памятным у летапісе дружбы балгарскага і савецкага народаў. У гэты дзень, 35 гадоў назад, быў заключаны гістарычны Дагавор аб дружбе, супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе паміж НРБ і СССР. Для Балгарыі гэта быў першы дагавор, заснаваны на поўным раўнапраўі і ўзаемным даверы паміж дзвюма суверэннымі дзяржавамі. Ён намеціў шлях, па якому зараз развіваецца і мацнее наша дружба і супрацоўніцтва ва ўсіх сферах жыцця. Для нашай краіны гэты дагавор азначаў адраджэнне пасля вайны, пераход да пабудовы сацыялізму. У міжнародным аспекце ён стаў састаўной часткай у палітычнай сістэме бяспекі і супрацоўніцтва.

Усё развіццё сацыялістычнай Балгарыі, яе эканомікі, навукі і культуры з'яўляецца нагляднym прыкладам увасаблення ў жыццё прынцыпаў нашага непарушнага саюза. За кароткі гістарычны перыяд Балгарыя, атрымліваючы падтрымку і брацкую бескарысную дапамогу Савецкага Саюза, ператварылася з адсталай аграрнай краіны ў сучасную індустрыяльную дзяржаву. Найбольш яркім сведчаннем рашаючай ролі балгара-савецкага супрацоўніцтва з'яўляюцца поспехі нашай краіны ў будаўніцтве развітога сацыялістычнага грамадства.

35 гадоў Дагавора аб дружбе, супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе паміж НРБ і СССР— гэта перыяд няспыннага развіцця, расшырэння і ўзбагачэння адносін паміж нашымі краінамі, поўнага росквіту балгара-савецкай дружбы і ператварэнне яе ў магутную стваральную сілу на карысць балгарскага і савецкага народаў.

Сечкаў Румян ТОДАРАЎ,
аспірант кафедры гісторыі СССР.

УВАГА: КОНКУРС!

УСЕСАЮЗНЫЯ КОНКУРСЫ студэнцкіх работ па грамадскіх навуках, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднаму маладзёжнаму руху сталі важнейшым сродкам выхавання студэнцкай моладзі ў духу камуністычнай ідэйнасці, савецкага патрыятызму і пралетарскага інтэрнацыяналізму.

Юбілейны X конкурс, прысвечаны 65-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і 60-годдзю ўтварэння СССР, праводзіцца з верасня 1982 да мая 1984 года.

Прадстаўленыя для ўдзелу ў конкурсе студэнцкія работы павінны быць самастойна выкананымі даследаваннямі з шырокім выкарыстаннем у іх прац класікаў марксізму-ленінізму, партыйных і савецкіх дакументаў, архіўных матэрыялаў, утрымліваць аргументаваную крытыку антыкамуністычных, буржуазных, рэфармісцкіх і рэвізіянісцкіх тэорый, фальсіфікацыі гісторыі і палітыкі КПСС, міжнароднага камуністычнага і рабочага руху.

X Усесаюзны конкурс студэнцкіх работ па грамадскіх навуках, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднаму маладзёжнаму руху праходзіць у чатыры туры.

Першы тур праводзіцца ў вышэйшых навучальных установах і заканчваецца к 1 студзеня 1984 года. Цэнтрам арганізацыі конкурсу на гэтым этапе з'яўляецца кожная вучэбная група ВНУ.

Другі тур конкурсу праводзяць абласныя, Мінскі гарадскі аргкамітэты. Ён заканчваецца к 15 лютага 1984 года вузаўскімі навуковымі студэнцкімі канферэнцыямі, якія праводзяцца па секцыях: гісторыі КПСС, марксісцка-ленінскай філасофіі, палітычнай эканоміі, навуковага камунізму, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху.

Трэці тур конкурсу праводзіцца да 1 красавіка 1984 года і заканчваецца рэспубліканскай студэнцкай канферэнцыяй «Саюз непарушны рэспублік свабодных», якая праводзіцца на базе Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна да 10 красавіка 1984 г.

На чацвёрты (Усесаюзны) тур X конкурсу прадстаўляюцца работы, выкананыя студэнтамі ВНУ, абмеркаваныя на вузаўскіх, абласных (краявых, гарадскіх), рэспубліканскіх навуковых студэнцкіх канферэнцыях. Да ўдзелу ў туры дапускаюцца работы, якія атрымалі пры рэцэнзаванні на ўсіх папярэдніх этапах толькі выдатныя ацэнкі.

А. НІКІЦЕНКА,
намеснік старшыні савета па НДРС.

СУСТРЭЧЫ ДЛЯ ВАС

Гэтая старонка — студэнцкія водгукі на творчыя кантакты з майстрамі культуры.

Прымае «Рунь»

На факультэце журналістыкі сталі традыцыйнымі сустрэчы з майстрамі паэтычнага слова. А. Вярцінскі і В. Быкаў, В. Зуёнак і многія іншыя неаднойчы наведвалі творчае студэнцтва факультэта. На гэты раз адбылася сустрэча з лаўрэатам прэміі Ленінскага камсамола Беларусі паэтэсай Яўгеніяй ЯНІШЧЫЦ.

— Дзень добры, дзень добры, — прывітальна ўсміхнулася Яўгенія Іосіфаўна, і адразу ў ленінскім пакоі, дзе сабраліся студэнты, стала цёпла і ўтульна.

Мы даведаліся аб радзіме Яўгеніі Іосіфаўны, аб той паэтычнай вёсцы, якая нарадзіла шмат легенд і паданняў, казак і народных прыказак, якая з самага дзяцінства і да гэтай пары, нібы невычарпальная крыніца, поіць творчасць паэтэсы сакавітым народным словам і музычнай вобразнасцю. Мы даведаліся аб паэтычных задумках і творчых справах, аб вялікай грамадскай дзейнасці паэтэсы.

Мы просім Яўгенію Іосіфаўну пачытаць свае вершы. І пачынаецца незвычайнае падарожжа ў краіну цудоўнага, у глыбінныя пласты чалавечай душы, ва ўнутраны свет нашага сучасніка. Слова за словам, радок за радком, вобраз за вобразам... Трапяткія думкі даходзяць да сэрца кожнага прысутнага. Паэтэса ў сваёй стыхіі. Мне здаецца, што песня яе зараз узмахне рукамі-крыламі, выпархне ў адчыненае акно лёгкай птушкаю, і там, дзе яе пачуюць людзі, назаўсёды знікнуць крыўда і зло.

Паслухаўшы некалькі вершаў майстра паэтычнага слова, сваімі творчымі здабыткамі пачынаюць дзяліцца студэнты Таццяна Гасціловіч і Віктар Бабей, Віктар Чарняўскі і Вячаслаў Маеўскі. У іх вершах шмат цікавых паэтычных знаходак і смелых думак, але гэта яшчэ толькі пачатак: кожнага з іх чакае ўдумлівая і ўпартая праца над словам. Яўгенія Іосіфаўна дае парады. Ёй спадабаліся вершы Валянціна Жданко.

Аб тым, якую вялікую карысць прыносяць такія творчыя сустрэчы для студэнтаў і тым больш для тых, хто спрабуе сваё пяро на паэтычнай ніве, гаварыць не даводзіцца. На развітанне паэтэса падарыла нам свой зборнік вершаў з аўтографам: «З надзеяй, што маладыя паэтычныя галасы будуць і рунець, і каласавацца».

С. РАМАНАВА,
студэнтка факультэта журналістыкі,
член літаб'яднання «Рунь».



ПАРТКОМ, ТАВАРЫСТВА балгара-савецкай дружбы і аддзел масавай работы бібліятэкі універсітэта правялі сустрэчу студэнтаў гістфака з заслужаным дзеячам мастацтва БССР, лаўрэатам прэміі Ленінскага камсамола рэспублікі рэжысёрам кінастудыі «Беларусьфільм» Ігарам Міхайлавічам Дабралюбавым. Кінарэжысёр падзяліўся ўражаннямі аб паездцы ў Балгарыю, расказаў пра сумесную работу беларускіх і балгарскіх кінематаграфістаў над фільмам «Братушка», адказаў на пытанні.

Р. ЛЯХОВІЧ,
загадчык аддзела бібліятэкі.

НА ЗДЫМКАХ: у час сустрэчы.
Фота **В. Шачака.**

Знайсці блізкага чалавека

Ёсць фільмы, якія назаўсёды застаюцца ў сэрцы разам з самымі дарагімі ўспамінамі. Нямала часу прайшло з дня выхаду на экраны шматсерыйнай кінастужкі «Народжаныя рэвалюцыяй», але тым не менш і зараз гэты фільм карыстаецца вялікай папулярнасцю ў гледачоў. У тым, што пастаянства сімпатый адносіцца перш за ўсё да таленавітых выканаўцаў галоўных ролей, яшчэ раз змаглі пераканацца ўсе, хто пабываў на сустрэчы студэнтаў БДУ імя У. І. Леніна з Наталляй Гвоздзікавай і Яўгенам Жарыкавым.

— У дзесятым класе думала, што буду стаматолагам, — расказвае Наташа, — і рыхтавалася паступаць у медыцынскі. Я ніколі не марыла стаць актрысай, а калі мая старэйшая сястра выбрала гэту прафесію, то ў сям'і ўсе вырашылі: артыстаў хопіць. І ўсё ж, прыйшоўшы на рэпетыцыю ў Ленінградскі тэатр мініяцюр, дзе сястра была занята ў спектаклях разам з Аркадзем Райкіным, я не змагла стрымаць захаплення. Вырашыла паспрабаваць сама. Так паступіла ў інстытут кінематаграфіі.

Акцёрскі лёс Наталлі Гвоздзікавай склаўся ўдала. «Горад першага кахання», «Небяспечныя сябры», «Вялікі перапынак», «Каліна чырвоная», «Каханне маё вечнае» — з году ў год «калекцыя» фільмаў, у якіх здымалася артыстка, папаўняецца. І ў кожным з іх Наталля Гвоздзікава знаходзіць нешта новае для сябе, падымаецца яшчэ на адну ступеньку вышэй у сваім акцёрскім майстэрстве.

Яўген Жарыкаў за дваццаць тры гады работы ў кіно зняўся ў 46 карцінах як савецкіх, так і замежных кінарэжысёраў. Сярод іх на першае месца акцёр вылучае стужку «Народжаныя рэвалюцыяй».

Гістарычная маштабнасць кінакарціны, глыбокі псіхалагізм дзеяння патрабавалі ад выканаўцаў максімальных сіл і аддачы. Але асноўны сакрэт поспеху ў на дзіва тонкім спалучэнні індывідуальных якасцей Н. Гвоздзікавай і Я. Жарыкава, у шчырасці пачуццяў герояў на экране і ў жыцці. Маладым мужу і жонцы, як нікому іншаму, былі блізкія душэўныя перажыванні іх персанажаў.

Знаёмства з рэальна існуючымі Марыяй і Мікалаем Кандрацьевымі, тысячы пісем з цёплымі водгукамі — усё гэта прынеслі ім здымкі фільма.

Э. ОЛІНА.

«Змагацца за праўду жыцця»

Асабістыя сустрэчы з артыстамі. Яны заўсёды хвалююць, абуджаюць цікавасць, прагу параўноўваць, даюць магчымасць глыбей асэнсаваць свет і сябе ў свеце.

ІМЯ ЗАСЛУЖАНАГА артыста РСФСР Рамана Хамятава добра вядома тым, хто захапляецца кіно. Многім гледачам запомніліся вобразы, створаныя ў фільмах «Жывыя і мёртвыя», «Стрэл у тумане», «Дзень анёла», «Сын чэмпіёна», «Хмары над Борскам». Дарэчы, роля звычайнага хлопца, які праходзіць праз усе выпрабаванні нянавісці і любві ваеннага ліхалецця, і з'явілася ў шасцідзесятым годзе першай сур'ёзнай працай пачынаючага артыста.

Зараз, праз 23 гады, ёсць што ўспомніць і расказаць. За гэты час Раман Хамятаў выканаў звыш сотні ролей у 65 кінастужках па сцэнарыях не толькі айчынных, але і замежных майстроў «дзесятай музы».

Героі Хамятава самыя розныя: сяляне, ваенныя, інжынеры, рабочыя. Розныя яны і па свайму сацыяльнаму абліччу. Дастаткова будзе сказаць, што прыкладна трэцюю іх частку складаюць адмоўныя персанажы.

— Акцёр павінен умець выконваць дыяметральна супрацьлеглыя ролі, — заўважае Раман Захаравіч, — і сапраўдным майстрам трэба лічыць таго, хто ўмее гэта рабіць там, дзе нельга схавацца за грым, дзе ты, як кажуць, на сто працэнтаў у кадры.

Звычайна, калі гутарка ідзе пра таго ці іншага пісьменніка, паэта або мастака, бадай, першае, што імкнуцца вылучыць даследчыкі, — гэта галоўную тэму, сцержнявы вобраз, які ўласцівы толькі гэтаму майстру. Тое ж самае датычыць творчасці кінаартыста. А калі гаварыць пра «калекцыю» асоб і тыпаў Рамана Хамятава, то з іх неабходна выдзеліць вобраз легендарнага камандарма Міхаіла Васільевіча Фрунзе. Да яго артыст звяртаўся у цэлым шэрагу карцін: «Таварыш Арсеній», «Канец чорнага консула», «Чырвоная плошча». За выдатнае выкананне гэтай ролі ў фільме мангольскіх кінематаграфістаў «Вялікі лёс» ён быў узнагароджаны медалём «60 год камуністычнай партыі Манголіі», які атрымаў асабіста з рук таварыша Цэдэнбала.

— Гэта мая этапная роля, — гаворыць Раман Захаравіч. — І ў тым, што я імкнуся да яе зноў і зноў, няма нічога незвычайнага: прапанова ўвасобіць хоць частку з багатай біяграфіі такога чалавека на экране зацікавіла б любога артыста.

Але шлях да раскрыцця гэтага вобраза быў не такім простым, як можа здацца. Раман Захаравіч расказаў пра сустрэчы з роднымі, з тымі, хто блізка ведаў славутага камандзіра і дзяржаўнага дзеяча. Цікавіла ўсё: чым займаўся Фрунзе ў час адпачынку, якія меў звычкі, што любіў чытаць. Можа таму, што ўсё гэта спазнана, пераасэнсавана, перажыта як асабістае, і ўдалося акцёру пазбегнуць схематызму і плакатнасці, на якія вельмі лёгка збіцца ў такіх гістарычных вобразах. «Акцёрскі абавязак — змагацца за праўду жыцця. Без гэтага мастацтва нічога не варта» — гэта дэвіз рэжысёра Васілія Сяргеевіча Ардынскага, з якім больш за ўсё давялося працаваць Хамятаву.

Асабістыя сустрэчы з артыстамі... Не думаю, што нехта з тых, хто прыйшоў у гэты вечар у актавую залу універсітэта, каб сустрэцца з Р. З. Хамятавым, будзе сцвярджаць, што дарэмна патраціў час.

В. ЧАРНЯЎСКІ,
член прэс-цэнтра прафкома.

СТУДЭНЦКАЯ РЭЦЭНЗІЯ

«У ВАЙНЫ НЕ ЖАНОЧЫ ТВАР»

ТАКАЯ АГУЛЬНАЯ назва цыкла дакументальных фільмаў публіцыста Святланы Алексіевіч і рэжысёра Віктара Дашука. Фільмаў пакуль чатыры: «Гэта была не я...», «Страляць хацела», «Раніца ў тумане, сівая раніца...», «Сустрэў я Вас!»

Першыя два — простыя і жорсткія, і адпаведна, назвы іх зусім не паэтычныя. Дарэчы, пры абмеркаванні гэтых стужак высветлілася, што далёка не ўсім падабаецца першы, дзе былая медсястра Вольга Амельчанка расказвае, як яна, акрамя таго, што вынесла з поля бою 137 параненых, аднойчы падняла ў атаку ўзвод, а затым сама, уласнымі рукамі расстраляла баязліўцаў. І, расказаўшы ўсё гэта, жанчына дадае, што часам здаецца, там, тады «гэта была не я...» Некаторыя мяркуюць: навошта паказваць жанчыну з такога негатыўнага боку, маўляў, не кожны мужчына-салдат, апалены вайной, згаджаўся страляць сваіх, хаця б і баязліўцаў, а тут — жанчына, якая расстрэльвае не па загаду, а добраахвотна...

Святлана Алексіевіч здолела адстаяць свой пункт гледжання. Яна пераканаўча гаварыла прысутным аб тым, што цыкл і называецца «У вайны не жаночы твар» і стваральнікі ў фільмах «Гэта была не я...» і «Страляць хацела» паказваюць, як вайна можа сказіць твар жанчыны — маці, жонкі, сястры... Медсястра расстрэльвае, зянітчыца Валянціна Чудаева (фільм «Страляць хацела») з усіх пачуццяў адчувае на вайне толькі страх, калі пікіруе «месершміт», і нянавісць, і прагу страляць.

«Вобразамі жанчыны на вайне падкрэслена агіднасць вайны», — сказаў Алесь Адамовіч. Дарэчы, ён акрэсліў у агульных рысах новы напрамак мастацкага адлюстравання вайны, своеасаблівым прыкладам якога можна лічыць цыкл В. Дашука і С. Алексіевіч.

Трэці фільм «Раніца ў тумане, сівая раніца...» — гэта лірычнае адступленне, прасякнутае сумам. На экране толькі Вечны агонь і помнікі, помнікі, помнікі... І сівыя людзі нясуць да іх кветкі і становяцца перад абеліскамі на калені. І ніводнага слова ўвесь фільм, толькі музыка. Але ўражанне ад гэтага не меншае, чым ад тых фільмаў, дзе пра вайну — жахлівыя падрабязнасці.

Пра музыку таксама спрачаліся: чаму ў ваенных фільмах гучаць мелодыі старажытных рускіх рамансаў. Справа, відаць у тым, што такім падборам мелодый падкрэсліваецца жаночая, лірычная тэма. Музыка нібы супрацьпастаўляецца ўключаным у фільм кадрам ваеннай хронікі. Яны зняты запаволенай здымкай, што выклікае ўражанне нейкага пакутлівага, цяжкага ўспаміну.

І, нарэшце, чацвёрты, самы нечаканы фільм «Сустрэў я Вас». Аб тым, як семнаццацігадовыя дзяўчаты сустракалі сярод франтавых дарог каханне...

І толькі вось — пажылая жанчына, з рукамі, пакалечанымі на вайне, калі яна выносіла з поля бою параненых, расказвае, што ў шчырасці кахання гэтага многія сумняваліся.

Але разам з тым былі і прыгожыя, вартыя высокай паэзіі пачуцці і сярод полымя вайны, калі сустрэчы былі кароткія, разлукі доўгія і трывожныя.

Вось коратка аб першых фільмах з цыкла «У вайны не жаночы твар». Так, работа яшчэ не закончылася. Хутка аўтары мяркуюць стварыць яшчэ дзве стужкі. Калі прыбавяцца дзве новыя карціны, увесь цыкл будзе займаць недзе паўтары гадзіны экраннага часу. І тут ёсць такая думка: навошта разбіваць гэты твор на асобныя пятнаццаціхвілінныя навэлкі і пускаць іх у якасці «часопісаў» перад фільмамі? На мой погляд, было б лепш паказваць яго як поўнаметражны.

Нягледзечы на спрэчныя моманты, усе, хто бачыў фільм, прызнаюць яго цікавым, а майстэрства стваральнікаў высокім. Цыкл, бясспрэчна, удаецца, і аўтары на правільным шляху. Як сказаў адзін з гледачоў: «З бруду вайны тут здабыта паэзія».

І. АРЛОЎ,
студэнт факультэта журналістыкі.

● ЧЭМПІЁН КРАІНЫ

ЦЯЖКА БЫЦЬ ПЕРШЫМ

ЯГО ДАЧЫНЕННЕ да гэтага віду спорту «выдае» на здымку хіба што шашачная дошка. Прымі яе фатограф, перш чым шчоўкнуць затворам фотаапарата, — і хто ведае, кім прадстаў бы перад намі старшы выкладчык кафедры тэарэтычнай фізікі, намеснік дэкана па рабоце з замежнымі студэнтамі фізічнага факультэта Георгій Іосіфавіч Пятровіч. Мо барцом, а мо цяжкаатлетам — балазе ростам і сілай прырода яго не абдзяліла. Але паколькі здымак такі існуе, то і размова сёння пойдзе пра Пятровіча-шашыста.

Напісаў так і падумаў: усё ж адказна расказваць пра чэмпіёна. Тым больш, што Георгій Іосіфавіч першы сярод першых шашыстаў не горада, не вобласці і не рэспублікі нават — краіны. Чэмпіён па перапісцы.

Мне не давялося прысутнічаць на турнірах з удзелам Пятровіча — не аматар. Аднак чуць — чуў: прыгожа гуляе, па-майстэрску! Калі б ва універсітэце існавала шкала індывідуальных паказчыкаў шашыстаў — рэйцінг, то ён, безумоўна, быў бы недзе...

— Недзе ў верхняй яе частцы, але ні ў якім разе не першы, — гаворыць Георгій Іосіфавіч. — Тут ужо У. В. Беляеўскі, выкладчык кафедры праграмірavання, неаднаразовы чэмпіён рэспублікі, удзельнік фінальных гульняў на Кубак СССР фаварытам з'яўляецца. Я ж больш «завочнік».

І тлумачыць:

— Справа ў тым, што гульня па перапісцы разлічана не на кожнага: ты не бачыш свайго саперніка, працаваць даводзіцца, так сказаць, у хатняй абстаноўцы. І як вынік — больш часу маеш на аналіз партыі, можна працаваць з падручнікам у руках. Іменна да такой гульні ляжыць у мяне душа.

Тут самы раз зрабіць невялікае ўдакладненне. Пачынаў Георгій Іосіфавіч сваю спартыўную біяграфію як шахматыст: аднойчы трапіла яму ў рукі кніга з аналізам партый вядомага амерыканскага майстра шахматнай гульні Морфі. Зацікавілі школьніка з Мар'інай Горкі невядомыя раней словы эндшпіль, цэйтнот... Захапіла і сама гульня. З дружбакамі сяды-тады сілай мераўся, за зборную каманду школы выступаць пачаў. Сам не заўважыў, як уцягнуўся. І калі ў 1962 годзе закончыў Пятровіч фізфак БДУ імя У. І. Леніна, то быў ужо кандыдатам у майстры спорту па ... шашках. Так-так, памылкі няма, па шашках.

— Сакрэт метамарфозы ў тым, — тлумачыць Г. І. Пятровіч, — што шахматы забіраюць шмат часу. А яго ў студэнта іншы раз катастрафічна мала. Давялося і мне шукаць выйсце з такой сітуацыі. Спыніўся на шашках, тым больш, што ў гады майго студэнцтва універсітэт быў багаты на даравітых шашыстаў. Займаліся тут Анатоль Гантварг, Алена Соркіна, Генадзь Хацкевіч. Адны імёны аб чым гавораць!

Мінулы год з'явіўся для Г. І. Пятровіча «залатым»: набраўшы ў фінале 12,5 ачка з 20 магчымых, ён упершыню заваяваў званне чэмпіёна краіны. Перамога тым больш важная, што ў напружаным, бескампрамісным па характару марафоне Генадзь Іосіфавіч абышоў такіх вядомых майстроў, як Вітаўтас Кіркус (Вільнюс), Юрый Рэзнік (Кішынёў)...

На маё пытанне, у чым сакрэт поспеху, Георгій Іосіфавіч адказвае адназначна:

— Ва ўменні лагічна мысліць і ў звычайным спартыўным шчасці. Я зусім не хачу сказаць, што мае саперніці пазбаўлены першага. У даным выпадку мне проста пашанцавала.

Пакінем гэта сцвярджэнне на сумленні чэмпіёна. Урэшце яно не пазбаўлена сэнсу: тэарэтычная падрыхтоўка ў Г. І. Пятровіча сапраўды салідная. Дарэчы, ён рэдагаваў кнігу Г. Хацкевіча «Дваццаць пяць урокаў шашачнай гульні» і шмат карыснага ўзяў для сябе. Але, згадзіцеся, шчасце шчасцем, а ўменне працаваць, настойлівасць, нацэленасць на перамогу — гэтага ў Пятровіча не аднімеш.

Яму падабаюцца турніры непрадстаўнічыя: за рызыку, за частыя хадынавінкі. Падабаюцца за тое, што саперніці ў іх гуляюць з нейкай асаблівай асалодай, для душы, а не дзеля канчатковага выніку. Іменна тады прыходзіць да Пятровіча натхненне і нараджаецца Майстар...

— Кожная партыя ў такіх турнірах мае свае адметныя рысы. Адна вызначаецца творчай асновай, другая — чыста спартыўным развіццём. У першым выпадку надоўга запомніцца партыя, якую я згуляў супраць Б. Рэзніка, а таксама сустрэча з эстонскім шашыстам А. Сільдам на Усесаюзным турніры, прысвечаным памяці чэмпіёна СССР Мядкова. Тут таксама дапамог яго вялікасць Выпадак: у бяспройгрышнай сітуацыі Сільд памыліўся, і перамога засталася за мной. А зрабі ён іншы ход— ісціна ўзяла б верх...

Г. І. Пятровіч часта вяртаецца ва ўспамінах у тыя часы, калі універсітэт славіўся сваімі майстрамі-шашыстамі, калі тут праводзіліся асабістыя першынствы, паказальныя турніры з удзелам вядомых прыхільнікаў гэтай цудоўнай гульні. Хто верне шашкам іх былую папулярнасць, дасць жыццё новым турнірам? Пытанне застаецца адкрытым.

...У снежні мінулага года пачаўся новы чэмпіянат краіны па рускіх шашках. Яго індэкс — Ф-18. Пакуль што запісана некалькі хадоў, і ўся барацьба наперадзе. Г. І. Пятровіч будзе абараняць чэмпіёнскі тытул. Цяжка давядзецца лідэру — супраць яго змагаюцца з патроенай энергіяй. Георгій Іосіфавіч разумее гэта і гатоў прыняць выклік. Ну, хто першы?

А. ЛАЗОЎСКІ.

СПАРТЫЎНЫ ВЕЧАР



СПАРТЫЎНЫ ВЕЧАР універсітэта, які адбыўся на мінулым тыдні, быў прысвечаны вынікам мінулага спартыўнага года. Ганаровымі гасцямі ў зале прысутнічалі трохразовы алімпійскі чэмпіён, неаднаразовы чэмпіён Еўропы і свету, заслужаны майстар спорту СССР А. Мядзведзь, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі, кампазітар, старшыня Федэрацыі цяжкай атлетыкі БССР І. Лучанок, старшы трэнер каманды РТІ, былы трэнер універсітэцкай зборнай па баскетболу А. Шукшын.

Адкрываючы вечар, загадчык кафедры фізвыхавання і спорту С. Макарэвіч адзначыў, што цяпер ва універсітэце займаецца фізкультурай і спортам звыш 10 тысяч чалавек, у тым ліку ў спартыўных секцыях — амаль 6 тысяч. За мінулы год падрыхтавана дзесяць майстроў спорту СССР, 35 кандыдатаў у майстры спорту СССР, 127 спартсменаў першага разраду, звыш 5 тысяч спартсменаў масавых разрадаў і 2 тысячы 600 значкістаў ГПА. Былі праведзены юбілейная XXX спартакіяда па дваццаці двух відах спорту, у якой удзельнічала звыш 6 тысяч чалавек, спартакіяда «Здароўе» сярод прафесарска-выкладчыцкага саставу, спартакіяда інтэрнатаў. Значна павялічылася колькасць студэнтаў і супрацоўнікаў, якія ўдзельнічаюць у турысцкіх паходах па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа.

Фінальным спартакіядным стартам папярэднічалі спаборніцтвы ў групах, на курсах, факультэтах. Асабліва арганізавана яны прайшлі на механіка-матэматычным, юрыдычным і гістарычным факультэтах.

Па выніках агляду-конкурсу на лепшую пастаноўку фізкультурнай і спартыўна-масавай работы першае месца заняў юрыдычны факультэт, другое — філалагічны, трэцяе — механіка-матэматычны.

Мінулы год быў адзначаны пад'ёмам спартыўна-масавай работы ва універсітэце. Калектыў універсітэта ў аглядзе-конкурсе сярод ВНУ рэспублікі заняў шостае места, а ў спартакіядзе — другое. Паспяхова выступілі каманды па цяжкай атлетыцы, мастацкай гімнастыцы, лёгкай атлетыцы, класічнай барацьбе, фехтаванню, футболу, веласіпеднаму спорту, жаночаму баскетболу.

На вечары юрыдычнаму, механіка-матэматычнаму факультэтам, факультэту прыкладной матэматыкі, якія занялі першыя месцы ў XXX спартакіядзе універсітэта, былі ўручаны пераходныя чырвоныя сцягі. Факультэты, прызёры ў спаборніцтвах спартакіяды, узнагароджаны кубкамі і граматамі рэктарата. Лепшыя спартсмены, арганізатары спартыўнай работы на факультэтах, трэнеры прэміраваны граматамі і каштоўнымі падарункамі рэктарата і спартыўнага клуба.

У заключэнне адбыўся святочны канцэрт і прагляд спартыўнага фільма.

В. АНДРЫЕВІЧ.

НА ЗДЫМКАХ: уручэнне ўзнагарод; аўтограф А. Мядзведзя — самы каштоўны падарунак.

Фота В. Шачака.



ПРАДСТАЎЛЯЕМ ЧЭМПІЁНАЎ

БАРАЦЬБА САМБА

Да 52 кг — С. Пяткун (мехмат)
Да 57 кг — Ю. Камароў (юрфак)
Да 62 кг — К. Дабрэга (фізфак)
Да 68 кг — В. Дуднік (юрфак)
Да 74 кг — А. Талканіца (факультэт радыёфізікі і электронікі)
Да 82 кг — А. Макрацоў (юрфак)
Да 90 кг — В. Матарас (юрфак)
Да 100 кг — А. Матулькоў (юрфак)
Звыш 100 кг — А. Галдукевіч (юрфак)

Прыводзім вынікі агульнакамандnай барацьбы на першынство універсітэта (ачкі, набраныя камандамі, ідуць у залік спартакіяды):

1. Юрфак	168
2. Біяфак	66
3. Гістфак	60
4. Мехмат	51
5. Фізфак	43
6. Хімфак	41
7. Геафак	33
8. Факультэт радыёфізікі і электронікі	20

Каманды ФПМ, журфака і філфака ў спаборніцтвах не ўдзельнічалі.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

24 сакавіка 1983 г.

Зак. 560. АТ 04118

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар

В. П. ВАРАБ'ЁЎ